# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

БДУ

11 снежня 2003 года, чацвер, № 19 (1884)


СУСТРЭЧЫ

## Мясцовая прэса чакае журналістаў

*3 снежня перад студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ выступіў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Васільевіч Русакевіч. Сустрэча адбывалася ў актавай залі ліцэя БДУ.*

Студэнтам было цікава даведацца, што калі на 1 студзеня 1995 года ў Рэспубліцы Беларусь было зарэгістравана 721 перыядычнае выданне, то на 1 лістапада 2003 года — 1484, у тым ліку 902 газеты, 520 часопісаў, 57 бюлетэняў, 3 каталогі, 2 альманахі.

Міністр адзначыў, што на працягу апошніх гадоў праблема забеспячэння кадрамі мясцовай прэсы застаецца актуальнай. Для вырашэння гэтай праблемы з 1997/98 навучальнага года на факультэце журналістыкі БДУ па ініцыятыве Мініінфармацыі ажыццяўляецца мэтавая падрыхтоўка журналістаў для рэдакцый абласных, гарадскіх і раённых газет. Усяго на сённяшні дзень на факультэце журналістыкі БДУ па мэтавай падрыхтоўцы навучаецца 79 чалавек. Акрамя нашага універсітэта журналістаў рыхтуюць і ў іншых ВНУ краіны. Так, у 1999/2000 навучальным годзе на філалагічных факультэтах Віцебскага і Гродненскага , а 2000/2001 гадах — Гомельскага універсітэтаў былі адкрыты аддзяленні "літаратурная праца ў газетах і часопісах", дзе таксама вялася мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў для рэдакцый раённых газет гэтых абласцей. Усяго цяпер у абласных універсітэтах па гэтай спецыяльнасці навучаецца 67 чалавек. А з сёлетняга навучальнага года пачалі рыхтаваць журналістаў у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце.

Такім чынам, зазначыў Уладзімір Русакевіч, праблема кадраў рэдакцый раённых газет магла б быць вырашана ў бліжэйшы час, калі б пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2002 годзе не была адменена мэтавая падрыхтоўка для рэдакцый рэгіянальных СМІ.

*Тацяна КУХАРЧУК*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*





АКТУАЛЬНА

## Хутка выйдуць новыя правілы паступлення ў ВНУ

Як паведаміў міністр адукацыі А.М. Радзькоў на сустрэчы са студэнтамі механіка-матэматычнага факультэта БДУ 26 лістапада, хутка выйдуць новыя правілы паступлення ў ВНУ. Апроч таго, ён пацвердзіў, што будзе ўведзены адзіны іспыт, які злучыць выпускныя і ўступныя экзамены па беларускай (рускай) мове. Адбывацца ён будзе ў выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання. Паялічыцца пералік прадметаў, па якіх школьнікі змогуць здаваць тэсты. Міністр распавёў таксама, што льготы для медалістаў не захаваюцца, а пераможцы алімпіяд па-ранейшаму будуць карыстацца перавагамі пры паступленні ў ВНУ.

А.М. Радзькоў распавёў аб праблемах па мадэрнізацыі айчыннай вышэйшай школы, якія спрабуюць вырашыць у міністэрстве. Напрыклад, дагэтуль няма дакладнага адказу на пытанне, ці варта ісці за адзінымі еўрапейскімі стандартамі ў адукацыі, як гэтага патрабуе далучэнне да Лісабонскай канвенцыі і Балонскай дэкларацыі, падпісаных нашай краінай. На думку міністра, еўрастандарты ніжэй за тыя, якія дзейнічаюць у Беларусі, а зніжаць якасць вышэйшай адукацыі няма сэнсу. Ёсць пытанне і з увязненнем двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі ў вышэйшай школе, з развіццём школьнай адукацыі на вёсцы.

Як зазначыў міністр, рэфармаванне сістэмы адукацыі — яшчэ досыць жывы працэс, таму свае прапановы могуць выказаць усе зацікаўленыя ў развіцці айчыннай адукацыі. А пра тое, што ў Беларусі школьнікі імкнуцца вучыцца, сведчыць тое, што на 10 тысяч насельніцтва ў нас прыпадае 340 студэнтаў.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Універсітэт XXI стагоддзя

Пры канцы лістапада ў Маскве прайшла II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Універсітэты і грамадства. Супрацоўніцтва ў XXI стагоддзі", арганізаваная Еўразійскай асацыяцыяй універсітэтаў. З прывітальным словам да гасцей і ўдзельнікаў звярнуўся рэктар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, прэзідэнт Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў, акадэмік Расійскай акадэміі навук В.А. Садоўнічы. Наш універсітэт быў прадстаўлены дэлегацыяй на чале з рэктарам В.І. Стражавым, старшынёй Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаваў-удзельніцаў СНД, які прачытаў пленарны даклад "Развіццё адукацыі ў сучасных умовах".

Праца канферэнцыі адбывалася па наступных секцыях "Роля еўразійскіх універсітэтаў у сучасным грамадстве", "Фармаванне новай якасці адукацыі ў XXI стагоддзі", "Інавацыйныя працэсы і выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у адукацыі і навуцы", "Формы супрацоўніцтва еўразійскіх універсітэтаў. Супрацоўніцтва універсітэтаў краінаў СНД", "Супрацоўніцтва студэнцкіх арганізацый у XXI стагоддзі. Праблемы і перспектывы", "Сацыяльна-працоўныя адносіны ва універсітэтах", "Міжуніверсітэцкае навукова-практычнае супрацоўніцтва ў пытаннях фізічнага выхавання студэнцкай моладзі", "Універсітэцкі музей у XXI стагоддзі".

*Тацяна КУХАРЧУК*

АДУКАЦЫЯ

## Дзве тысячы за два гады

У Рэспубліканскім цэнтры Інтэрнэт-адукацыі пры БДУ 21 лістапада адбыўся юбілейны, 50-ы выпуск. За 2 гады працы спецыялісты ў галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій падрыхтавалі 2000 настаўнікаў агульнаадукацыйных школ з усіх рэгіёнаў краіны. Усе выпускнікі цэнтра даюць высокую адзнаку навучальнаму працэсу: пра гэта сведчаць шматлікія падзякі на адрас цэнтра ад кіраўнікоў навучальных установаў, чые выкладчыкі авалодвалі інфармацыйнымі тэхналогіямі ў Мінску.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

СЕМІНАРЫ

## Пра тэсты і адзіны экзамен

*Рэспубліканскі семінар, прысвечаны праблемам цэнтралізаванага тэсціравання і адзінага экзамену, адбыўся 2—3 снежня на базе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ.*

Падчас мерапрыемства абмяркоўваліся айчынныя і замежныя тэхналогіі тэсціравання, актуальныя праблемы праваднення тэсціравання і адзінага экзамену і шляхі іх вырашэння. Удзел у працы семінару прынялі кіраўнікі беларускіх ВНУ і дырэктары рэгіянальных цэнтраў тэсціравання Беларусі. З дакладам пра асноўныя кірункі рэфармавання сістэмы адукацыі ў Беларусі выступіў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Пра мадэлі тэсціравання і практыку іх ужывання ў Расіі распавёў дырэктар Цэнтра тэсціравання Мінадукацыі Расіі Уладзімір Хлебнікаў.

НАВУКА

## Даследчая дзейнасць студэнтаў

*Студэнты, магістранты і аспіранты ВНУ, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі, прынялі ўдзел у VIII Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "НДРС 2003". Яна адбылася ў Мінску 9—10 снежня.*

Форум праходзіў адначасова ў чатырох ВНУ сталіцы. У прыватнасці, у нашым універсітэце адбываліся дыскусіі па прыродазнаўчых навуках, правазнаўстве і філалогіі. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце прайшлі пасяджэнні па эканамічных дысцыплінах і галіновых навуковых кірунках (архітэктура, будаўніцтва, транспарт, машына- і прыборабудаванне, інфармацыйныя тэхналогіі, энергетыка, экалогія), у Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце — па медыцыне і фармацэўтыцы, у Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце — па аграрна-інжынерных навуках.

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

КАНФЕРЭНЦЫІ

# Журналістыка — 2003



*V міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Журналістыка — 2003" прайшла 4—5 снежня на базе факультэта журналістыкі нашага універсітэта.*

Удзел у пленарным пасяджэнні прынялі міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ул.В. Русакевіч, першы намеснік начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ул.Ф. Холад, начальнік НДЧ БДУ Ул.В. Панарадаў, дэкан факультэта журналістыкі В.П. Вараб'ёў, генеральны дырэктар ЗАТ "II Нацыянальны тэлеканал" Р.Л. Кісель, старшыня Беларускага саюза журналістаў Л.С. Екель, загадчык кафедры Інстытута журналістыкі Кіеўскага нацыянальнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі прафесар Н.Н. Сідарэнка, дацэнт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта І.Н. Тхагушаў.

На канферэнцыі працавалі секцыі сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку, тэлебачання і радыёвяшчання, тэхналогій камунікацыі, замежнай журналістыкі і літаратуры, літаратурна-мастацкай крытыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, гісторыі журналістыкі і літаратуры. Апрача навукоўцаў БДУ ў працы канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, Нацыянальнай акадэміі навук, часопіса "Мастацтва" і інш., а таксама навукоўцы з Украіны, Расіі, Кыргызстана, Літвы.

*Фотаздымкі Уладзіміра ЛАДУДЗЬКІ і Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА*





ПРАКТЫКА

# Студэнты ў ролі суддзяў

15 лістапада 2003 года ў Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусь адбылося імправізаванае судовае пасяджэнне, мэтай якога было ўстанавіць, ці адпавядае існаванне смяротнай кары ў нашай дзяржаве канстытуцыйным нормам. Студэнты II курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта мелі магчымасць прыняць удзел у абмеркаванні гэтага актуальнага пытання. Мерапрыемства праводзілася па ініцыятыве Старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь Р.А. Васілевіча, які чытае курс канстытуцыйнага права ў нашым універсітэце.

Р.А. Васілевіч сам размеркаваў ролі ўдзельнікаў пасяджэння Канстытуцыйнага суда паміж студэнтамі: дзесяць з іх выступілі ў ролі суддзяў, адзін заняў пост Старшыні, пяцёра мелі гонар ўвасобіцца ў ролю прадстаўнікоў Палаты прадстаўнікоў, столькі ж — у ролю прадстаўнікоў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Былі размеркаваны таксама ролі прадстаўнікоў Вярхоўнага суда, Вышэйшага Гаспадарчага суда, Генеральнага пракурора, намесніка прэм'ер-міністра, міністра юстыцыі, эксперта, астатнія занялі месцы прысутных у зале.

На працягу чатырох гадзін ішла палеміка паміж "прадстаўнікамі Палаты прадстаўнікоў" і "прадстаўнікамі Савета Рэспублікі": першыя выступалі за адмену смяротнай кары, другія — за яе захаванне. Падчас спрэчак былі выказаны цікавыя ідэі, якія, па словах Р.А. Васілевіча, могуць быць скарыстаныя пры абмеркаванні пытання ў судзе.

"Прадстаўнікі Палаты прадстаўнікоў" абапіраліся на тое, што існаванне інстытута смяротнай кары не з'яўляецца гуманным і парушае правы чалавека. Яны лічаць таксама, што гэтая мера не з'яўляецца найбольш эфектыўным спосабам барацьбы са злачыннасцю. Важкім аргументам, на думку будучых юрыстаў, з'яўляецца такое палажэнне Рэкамендацыі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ад 4 кастрычніка 1994 года: "Смяротная кара не павінна мець месца ў агульна-крымінальных сістэмах цывілізаваных дзяржаў", якой з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Адстойваючы свой пункт погляду, яны спыніліся на артыкуле 24 Канстытуцыі, які пачынаецца словамі "Кожны мае права на жыццё". Гэтыя словы сталі лейтматывам іх выступленняў.

"Прадстаўнікі Савета Рэспублікі" супрацьпаставілі гуманнасці дрэнныя ўмовы ўтрымання ў турмах і прывялі звесткі сацыялагічнага апытання: 65% насельніцтва краіны расцэньваюць пажыццёвае зняволенне як больш суровае пакаранне, чым смяротную кару. "Грамадства не дасягнула ўзроўню маральнага развіцця і гуманнасці, каб мы маглі сцвярджаць, што грамадства разумее і менш суровае пакаранне", — зазначылі яны.

Смяротная кара накіравана на абарону правоў іншых людзей, забойца ж уяўляе небяспеку для грамадства, процідастаўляючы сябе яму і дзяржаве. "Прадстаўнікі Савета Рэспублікі" звярталі ўвагу аўдыторыі на вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 1996 года, якія сведчаць самі за сябе: 80 % выказалася супраць адмены смяротнай кары.

Цікавым фактам завяршыў выступленне "Генеральны пракурор", выказаўшы сваё стаўленне да абмеркаванай праблемы: "Пракуратура яшчэ ні разу не апратэставала рашэнне замяніць смяротную кару пажыццёвым заключэннем".

Студэнцкі "Канстытуцыйны Суд" у адпаведнасці з працэдурай вынес заключэнне, у якім вырашыў прызнаць палажэнні Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь, што прадугледжваюць пакаранне смяротнай карай, не адпаведнымі Канстытуцыі ды іншым заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь, а таксама агульнапрызнаным прынцыпам міжнароднага права.



*Аляксей ЧЭЧНЕЎ, студэнт II курса юрыдычнага факультэта*
*Фотаздымак Мікалая МАРКОЎНІКА, студэнта II курса юрыдычнага факультэта*

ПОСТФАКТУМ

# Актуальныя праблемы геалогіі

Пры канцы лістапада ў нашым універсітэце прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя "Карысныя выкапні Беларусі", прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння заснавальніка беларускай геалагічнай навук, прафесара Мікалая Бліядухі. Як адзначыў на адкрыцці канферэнцыі дэкан геаграфічнага факультэта, доктар геаграфічных навук прафесар І.І. Пірожнік, даследаванні М. Бліядухі зрабілі неацэнны ўнёсак у спазнанне геалагічнай будовы нетраў Беларусі, вывучэнне карысных выкапняў і стварэнне мінеральна-сыравіннай базы для прамысловасці краіны.

Удзел у форуме прынялі спецыялісты з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Падчас канферэнцыі навукоўцы абмеркавалі актуальныя праблемы геалогіі радовішчаў і рацыянальнага нетракарыстання. Арганізатарамі форуму выступілі БДУ, Беларускае геаграфічнае таварыства, Беларускае геалагічнае таварыства, Беларуская горная акадэмія, ААТ "Белгархім".

*Паводле інфармацыі БЕЛТА*

АБ'ЯВЫ

**ВУЧЭБНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ЎСТАНОВА БДУ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу кафедраў:*

філасофіі і культуралогіі — загадчык (1), старшы выкладчык (1);

сучаснага прыродазнаўства — дацэнт (1);

тэхналогій адукацыі — дацэнт (1), старшы выкладчык (1).

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 215, тэл. 228-13-84.*

ПАДАРОЖЖЫ

# Невядомыя скарбы Беларусі

Іспанія вабіць нас карыдай, Бразілія — карнавалам, Францыя — Лазурным берагам. А чым вабіць Беларусь? Можна ўспомніць Белавежскую пушчу, Мірскі замак, Нясвіж, Мінск (як сталіцу). Можна ўспомніць яшчэ некалькі мясцін, але наўрад ці іх будзе шмат. І што, усё? Няўжо ў Беларусі няма чаго паглядзець?

Таму было вельмі дзіўна бачыць аб'яву, дзе гурток сацыяльна-эканамічнай геаграфіі геаграфічнага факультэта запрасіў на экскурсію па Беларусі па зусім невядомых мясцінах.

Цікаўнасць перамагла — і мы ўжо ў дарозе. Наведалі Лагойшчыну, Докшыцы, Порплішча, Глыбокае, Удзела, Мосар. Ці чулі вы гэтыя назвы раней? Прызнаемся, мы некаторыя з іх таксама пачулі ўпершыню.

Першая частка нашай дарогі была прысвечана помнікам Вялікай Айчыннай вайны. Лагойшчына вызначылася сваім партызанскім рухам, паказваючы непакорлівы характар людзей, непрыманне няволі. Таму тут шмат помнікаў, прысвечаных подзвігам партызанаў. У Бягомлі існуе Музей партызанскай славы, дзе нават захаваўся самалёт таго часу. Але, з іншага боку, актыўная барацьба партызанаў выклікала асаблівую жорсткасць фашыстаў. Менавіта тут знаходзіцца вядомая ўсяму свету вёска Хатынь. Адна з малавядомых, але з не менш жахлівым лёсам, вёска Шынёўка. У 1943 годзе яна была зусім маленькая: 22 дамы, 67 жыхароў, сярод якіх 16 дзяцей. Фашысты патапілі дзяцей у калодзежы, а потым спалілі вёску разам з жыхарамі. І цяпер толькі мемарыяльны комплекс нагадвае нам аб трагедыі: больш няма каму. У цэнтры — фігура жанчыны, якая падняла рукі ў праклёне. Каля яе тры званы, адзін з іх ужо звінець ніколі не будзе, бо расколаты — гэта сімвал таго, што кожны трэці жыхар Докшыцкага раёна загінуў у час вайны. І словы з Хатыні тут дарэчы: "Ніхто не забыты, нічога не забыта". Спадзяемся, не толькі наша пакаленне, якое не бачыла гэтай жудаснай вайны, але і наступныя будуць помніць гераічны подзвіг беларускага народа.

Але вернемся да сучаснасці. Едзем далей, дзе нас чакаюць сапраўдныя цуды. У краі, дзе мы падарожнічаем, пашырана каталіцтва, але ёсць і праваслаўныя храмы.

Вось у вёсцы Порплішча побач з сучасным касцёлам размясцілася праваслаўная царква. Яна вельмі старая, адносіцца да XVI стагоддзя. Храм драўляны і з-за свайго старога веку выглядае дрэнна: сцены пакасіліся, фарба аблезла. Нягледзячы на гэта, багаслужэнне тут вядзецца. А мясцовыя людзі так гавораць пра суседства двух храмаў: "Мы спачатку ў касцёл сходзім, а потым у царкву — а якая розніца, Бог жа адзін".

У Глыбокім тое ж добрасуседства: на адной плошчы знаходзяцца царква і касцёл. Прычым царква ў імя Нараджэння Багародзіцы з'яўляецца кафедральным саборам, а касцёл Святой Тройцы — фарны.

Едзем далей, а ў галаву лезуць думкі. Вось якія мы, беларусы, добрая нацыя, верацярпімая. У адным паселішчы існуюць і касцёл, і царква — і гэта нікому не замінае, не ўзнікае ані спрэчак, ані сварак.

Думкі думкамі, а экскурсавод Анатоль Георгіевіч Варава (якому выказваем шчырую ўдзячнасць) расказвае нешта цікавае пра мястэчкі. Яшчэ ў XVI стагоддзі з'явіліся яны на Беларусі. Але пры савецкай уладзе мястэчкі былі скасаваны. Слухаючы ўважліва, не заўважылі, як прыехалі ў наступны пункт нашай экскурсіі — дарэчы, былое мястэчка, а цяпер вёску Удзела. Тут знаходзіцца францысканскі рыма-каталіцкі касцёл Беззаганнага зачацця найсвяцейшай Марыі Панны, пабудаваны ў XVIII стагоддзі. Тут нас уразіў не сам касцёл, а ксёндз, які знайшоў незвычайны падыход да дзяцей: ён стварыў батлейку — лялечны тэатр, у якім паказваюцца сцэнкі рэлігійнага характару. Ксёндз зрабіў усё сваімі рукамі. Нават нас, ужо немалых, гэты спектакль (па-іншаму і не назавеш) вельмі ўразіў. Вось якія людзі ёсць! Яны не засяроджваюцца на сваім жыцці, а ствараюць цуд для іншых людзей, робяць іх больш шчаслівымі.



Шкада развітвацца, але едзем далей. Мосар — вось сапраўдны цуд нашай краіны!

На аснове касцёла святой Ганны быў створаны цэлы комплекс пабудоў, кветкава-каменных кампазіцый. Тут ёсць спецыяльны дом для пілігрымаў. Кожнаму тут радуюцца. Бог не абмінуў гэтае месца ўвагай: тут б'е крыніца са святой вадой, куды вядзе прыгожа ўладкаваная дарога, паабапал якой размешчаны камяніскі, пасаджаны кветкі. Вакол касцёла былі выкапаны сажалкі, якія вельмі ўдала ўпісваюцца ў мясцовыя краявіды. І ўсё гэта — ініцыятыва аднаго чалавека, ксяндза Юзафа Булькі, які прыехаў у гэты край дваццаць гадоў таму, і цяпер дзякуючы яму і мясцовым людзям гэтая мясціна ператварылася ў сапраўдны цуд.

Хочацца спадзявацца, што такіх, не адкрытых для шырокай публікі месцаў у Беларусі яшчэ шмат. І мы верым, што дзякуючы нашаму універсітэту, і геаграфічнаму факультэту ў прыватнасці, гэтыя мясціны будуць вядомымі.

*Людміла ГРЭСЬ,*
*Юлія БОГДАН,*
*студэнткі геаграфічнага факультэта*

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Выдадзена ў БДУ

*По папярэдніх падліках можна сказаць, што ва ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ ў гэтым годзе паступіла амаль 400 рукапісаў падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, курсаў лекцый, вучэбна-метадычных комплексаў, манаграфій і інш.*

*На сённяшні дзень выдадзена 329 кніг і брашур, якія папоўнілі фонды універсітэцкай бібліятэкі.*

*У Рэдакцыйна-выдавецкім савеце універсітэта цяпер праходзіць абмеркаванне праект Тэматычнага плана выдання вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навуковай і даведачнай літаратуры на будучы 2004 год.*

*В.И. Бахтин, А.П. Коваленок, А.В. Лебедев, Ю.В. Лысенко.* **Исследование операций.** У курсе лекцый выкладаюцца два раздзелы метадаў даследавання аперацый: тэорыя рашэння экстрэмальных задач на графах і тэорыя некааператыўных гульняў.

**Осмотр места происшествия.** *Аўтары-складальнікі А.Я. Гучок, І.А. Мароз.* У практыкуме, прызначаным для студэнтаў юрыдычнага факультэта, падаецца тэарэтычны матэрыял аб арганізацыйных, тактычных і тэхнічных сродках, неабходных для правядзення агляду месца здарэння.

*Э.А. Усовская.* **Постмодернизм в культуре XX века.** У навучальным дапаможніку аналізуецца месца і роля постмадэрнізму ў сучаснай культурнай прасторы, разглядаюцца канцэпцыі постмадэрнізму, яго асноўныя паняцці і катэгорыі.

**Developing Cross-cultural Skills: Idioms in Mass Media.** *Аўтар-складальнік Т.В. Пархамовіч.* Навучальна-метадычны дапаможнік для студэнтаў факультэта журналістыкі мае на мэце азнаёміць чытача і дапамагчы яму авалодаць найбольш ужывальнымі ідыёмамі ў сродках масавай інфармацыі.

**Книга для чтения на португальском языке.** *Аўтары-складальнікі Т.С. Шарупіч, В.С. Хахолка.* Навучальны дапаможнік для студэнтаў факультэта міжнародных адносін змяшчае мастацкія і публіцыстычныя тэксты партугальскіх і бразільскіх аўтараў.

*С.Б. Жарко, А.В. Мартынюк.* **Монгольское нашествие на Русь.** Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь падае гісторыю мангольскага нашэсця на Русь у XIII ст. Даследуюцца склад і колькасць арміі Батыя, характарызуюцца этапы мангольскіх паходаў у Усходнюю Еўропу.




*Г.А. Медведев.* **Математические основы финансовой экономики. В 2-х частях. Ч. 2: Определение рыночной стоимости ценных бумаг.** У навучальным дапаможніку, дапушчаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, выкладаюцца асноўныя раздзелы курсаў "Матэматычныя асновы фінансавай эканомікі" і "Дынамічная тэорыя ацэньвання фінансавых актываў".




*Н.А. Зайцева.* **Чешская Республика: Пособие по страноведению.** Тэксты, змешчаныя ў дапаможніку, апісваюць розныя рэгіёны краіны, з'яўляюцца добрай рэкамендацыяй для арганізацыі адпачынку. Кніга складаецца з дзвюх частак — на чэшскай і рускай мовах.

*О.А. Кульпанович.* **Экономика труда медико-социальной сферы.** У навучальна-метадычным дапаможніку выкладаюцца арганізацыйныя і заканадаўча-нарматыўныя асновы эканомікі працы і працоўных рэсурсаў медыка-сацыяльнай сферы, аховы здароўя ў цэлым і асобнай лекава-прафілактычнай установы.

*В.П. Буко, А.Г. Папкович.* **Lese- und Übungsbuch für Physiker / Немецкий для физиков.** Навучальны дапаможнік змяшчае арыгінальныя тэксты з навукова-папулярнай літаратуры Германіі па актуальных праблемах сучаснай фізікі, электронікі, астраноміі.

**З пашанай і цеплынёй да Alma Mater.** *Аўтары-складальнікі А.А. Яноўскі, А.Г. Зельскі, В.М. Шэін.* У выданне ўвайшлі невядомыя ці малавядомыя дакументальныя гістарычныя матэрыялы і публіцыстыка рознага часу, прысвечаныя ўплыву БДУ на розныя сферы жыцця беларускага грамадства.

**Актуальные проблемы развития правовой системы современного общества.** Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў. У зборніку надрукаваны тэзісы дакладаў студэнтаў і аспірантаў ВНУ Беларусі і іншых краін СНД на навуковай канферэнцыі, прысвечанай актуальным праблемам развіцця прававой сістэмы сучаснага грамадства.

*В.А. Фядосік, І.А. Еўтухоў, А.А. Прохараў і інш.* **Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя. У 2-х частках. Ч.2.** Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разглядае палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Еўропы ў XIV—XV ст., а таксама культуру і побыт усяго сярэднявечча.




**Эффективность уголовной юстиции в контексте верховенства права.** Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі змяшчаюць тэзісы дакладаў і паведамленняў па актуальных праблемах фарміравання і дзейнасці крымінальнай юстыцыі ў паслярэформенны перыяд.

*Н.В. Сторожев, И.П. Кузьмич.* **Аграрное право Республики Беларусь.** У курсе лекцый раскрываецца змест асноўных інстытутаў агульнай часткі аграрнага права Беларусі.




**Месторождения калийных солей Беларуси: геология и рациональное недропользование.** *Пад рэд. Э.А. Высоцкага, В.М. Губіна.* Манаграфія абагульняе веды па геалогіі радовішчаў калійных соляў Беларусі.

*Е.И. Василевская.* **Теория и практика реализации преемственности в системе непрерывного химического образования.** У манаграфіі паказваюцца вынікі тэарэтычнага і практычнага разгляду асобных аспектаў рэалізацыі пераемнасці пры вывучэнні хіміі ў сістэме "сярэдняя школа — ВНУ — паслядыпломная адукацыя".

**География международного туризма. В 2-х частях. Ч. 2.** У дапаможніку для студэнтаў геаграфічнага факультэта разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя і геаграфічныя фактары развіцця міжнароднага турызму ў краінах СНД і Балтыі.

**Химические проблемы создания новых материалов и технологий. Вып. 2.** У зборніку артыкулаў паказаны вынікі фундаментальных і прыкладных даследаванняў Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем за апошнія гады па асноўных навуковых кірунках яго дзейнасці.

**Право и демократия. Вып. 14.** У зборніку навуковых работ змешчаны артыкулы аб праваўтварэнні, праватворчасці, правах чалавека, прававой дзяржаве, гісторыі Беларусі.

*В.М. Анищик, В.В. Углов.* **Модификация инструментальных материалов ионными и плазменными пучками.** Выданне распавядае аб працэсах, якія адбываюцца ў мішэнях пры ўздзеянні іонных і плазменных пучкоў.




*С.Г. Мулярчик.* **Вычислительная электроника.** У канспекце лекцый выкладаюцца лікавыя метады рашэння тыпавых задач матэматычнай электронікі.

*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы*

*Вынікі конкурсу літаратурных твораў, які праводзіў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі БДУ ў рамках святкавання 82-й гадавіны нашага ўніверсітэта, былі падведзены 4 лістапада 2003 года.*

*Павіншаваць з днём нараджэння свой улюбёны ўніверсітэт наважыліся каля 40 чалавек. Па выніках конкурсу былі абвешчаны пераможцы ў трох намінацыях: "За арыгінальнасць", "За веру і аптымізм да БДУ" і "Найлепшы вершаваны твор".*

**Ирина БАСЛЫК**
*студентка биологического факультета, победительница конкурса литературных произведений «Студенческая жизнь» в номинации «За оригинальность»*

# Безутешно Глядящих Утешьте...

## Элегия-аллегория

*Beati possidentes...*
*Gaudeamus igitur...*
*Utile dulci miscere...*

Ах, как тепло и тихо было здесь!

Он проковылял к ближайшему кратеру, вскарабкался на большой камень на его краю, сел, свесил лапы вниз и уставился в небо. Впрочем, нет, сначала он обернулся — полюбоваться на пока не очень длинную, но, безусловно, имеющую будущее цепочку своих следов. Точнее, на две цепочки и полоску от хвоста. Такие он уже оставлял на первой, второй, третьей и четвертой планете. Но здесь свет звезды был спокойнее и мягче, а сам он себя считал Бурсаком, Глядящим Умудренно. Сейчас он смотрел на свои следы, а видел перед собой нехоженую гладь песка — иди, куда хочешь, видел лужицы еще не остывшей лавы и подозрительные болотца с тиной — не наступить бы, видел кустики, покрытые ярко красными ягодами, — от таких у него страшно болел живот на второй планете, видел разноцветные манящие цветы — обязательно понюхать! Видел непонятные, причудливые скульптуры и причудливых зверей — что с ними делать? А еще видел занимающийся розовокрылый рассвет, там, впереди, на краю земли. И так ему было радостно, и тоскливо, и страшно, и горячо от всего этого, что, сидя на камне, поднял БГУ глаза в небо — на висящую над ним громаду звезды по имени БГУ — и тихонько завыл.



А потом, прижав к груди Большой Голубенький Учебник (такой родной в этом мире!) и шепча молитвы светилу, зовущемуся в этот момент для БГУ «Безоблачные Годы Удовольствий», наш герой слез с камня, улегся тут же под его надежным боком на землю и заснул сладко-сладко — словно наплакавшийся ребенок, уверовавший в то, что он любим...

### СОН ПЕРВЫЙ.

Первая планета была такая... такая... ух! Быстро неслась она вокруг звезды, быстро кружилась вокруг собственной оси. Попав на нее с маленького астероида, БГУ забыл обо всем. Широко открытыми глазами он смотрел на умопомрачительные вещи, творящиеся здесь, — и ничего не понимал. И назван был Бурсачишкой, Глядящим Удивленно. Такие же, как он, стояли рядом и так же, как он, глазели на шутихи, разрывающиеся в незнакомом небе, на вечную борьбу двух противоположностей Обучения и друг на друга. Стояли и глазели. Стояли до тех пор, пока к ним не пришла Она — карающая и награждающая, легкая и непреодолимая (ишь ты, и в этом была двойственность). Пришла и пнула. Взвизгнули бурсачишки, потерли ушибленные места, пошевелили мозгами и прочими полезными местами, и понеслось... и поняли они, что приняты в Братство Готовящихся к Успеху, что они теперь — в Братстве Гордящихся Университетом.

Не все снесли Бремя Гонений и Учебы, зато каждый оставшийся нашел себе место в этом мире — кто среди роз, а кто в уютной семейной норке, кто на вершине горы, а кто в тенистой сонной роще. Были те, что предпочли дно прозрачных рек или поле сладких-сладких цветов, и те, что полюбили солоноватый вкус гранитных обломков у подножия монолитных гранитных скал.

Каждый нашел себе место...

### СОН ВТОРОЙ.

Вторая планета была их планетой, они стали здесь хозяевами жизни. А что же вы думали? Чего не видали Бурсаки, Глядящие с Ухмылкой? Через что они не прошли? Сталкивались уже и с дружбой, и с ненавистью, и с настоящим счастьем, и с тяжелым горем. Жили как настоящие бурсаки, Без Гастрономических Утех, и сплотились в Банду Голодных и Ушлых, отмахивались от огненных птиц, стучащих в окна по утрам, и как минимум два раза в год блуждали по Беспросветным Гротам Ужасов. Пьянели от осознания себя частью этого мира и от чаепитий в Баре «Глотни и Успокойся», преклонялись перед Блестящим, просто Гениальным Умом, спорили с Бестолковым до Глупости Уставом общего жития (Безобразия, Грозящие им Управой, были их ответом на принуждения и тоталитаризм), становились вдруг Без Глаз и Ушей, покрывая друг друга (лишь Бремя Гордости и Убытков было им наградой). Глядели Упрямо, Устало, с Упреком, с Улыбкой...

И все они занимались делом: кто ловил Больших Гремучих Ужей, кто получал Борные Гидратные Уреаты, кто критиковал Белорусско-Гвианскую Унию...

Все они занимались делом.

### СОН ТРЕТИЙ.

Горное плато. Громкая музыка, смех и крики. Вихрь свободы и упоения. Бал Гротескных Удовольствий. В просветах между разгоряченными телами и увлеченными лицами видно: впереди облака, позади облака...

Перевал...

### СОН ЧЕТВЕРТЫЙ.

А был ли он?

От ужаса БГУ подхватился, стукнулся башкой о приютивший его камень, пискнул, ощупал хвост и понял — нет, было. Все было — и четвертая планета, и сны, и звезды... Тогда пал БГУ ничком, всеми четырьмя лапами обнял родную землю, обогреваемую родным светилом, и решил, что никуда не уйдет. А будут отрывать — лучше умрет. Но время шло, животу становилось все холоднее и голоднее... Поднялся БГУ и, забыв об учебнике, побрел восвояси, оступаясь и пошатываясь почему-то. Вот чего не было на пятой планете — твердой почвы под ногами, так, видимость одна, а на самом деле зыбкость какая-то да еще толчки подземные... А зазеваешься — унесет гейзером на спутник последнего астероида, и притяжение БГУ не поможет... А как хорошо все начиналось... А сейчас, сейчас нет у него ни дела, ни места... Чувствуя себя изгнанником, БГУ злобно глянул на отдалившуюся звезду, наступил правой лапой в черную лужу, выругался и плюнул ядом. Крикнул, что ему все надоело здесь, что он хочет улететь. Высоко подпрыгнул. И почувствовал, как земля спружинила, как подбросила его. Выше, еще выше, еще. С очередным прыжком БГУ ощутил: воздух держит, планета — внизу, и лапами махать не надо, можно даже важно заложить их за спину. Он изобразил пике и мертвую петлю, пару раз кувыркнулся с визгом и, наконец, воспарил к небу.

Зависнув в воздухе, смотрел БГУ на пять планет — на пять своих собственных планет, подаривших ему невыразимо счастливое время и себя самого. Потом бережно уложил все пять к себе в душу, на бархат благодарности, отломил добрую половину своего сердца, толкнул ее по направлению к ласковой мудрой звезде и отвернулся.

Рассвет за далеким горизонтом манил его все сильнее. БГУ вздохнул полной грудью и рванулся вперед.

Туман раннего утра становился все гуще...

---

*У маладосці ўсе пішуць вершы, асабліва студэнты. Сёння на старонцы газеты будучыя навукоўцы, педагогі, спецыялісты ў галіне жывой прыроды — студэнткі прыродазнаўчых факультэтаў з'яўляюцца ў іпастасі творцаў мастацкага слова.*

*Увесь іх жыццёвы шлях сёння змяшчаецца ў 5-6 радкоў: нарадзілася, вучылася, скончыла, працавала, паступіла. Але вершы, паэзія — вышэй за ўсё!*

*Таму — сустракайце, чытайце, ацэньвайце!*

*Яго Вялікасць Натхненне...*

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДУ,*
*сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў*

**Вікторыя ВАБІШЧЭВІЧ**
*студэнтка біялагічнага факультэта БДУ*

***

Будучы каханай —
Забываеш пра здраду,
Будучы адной —
Думаеш пра маці,
Будучы з сябрамі —
Весела шчабечаш,
Будучы з слязою —
Чакаеш толькі смерці.
Верыць ты не хочаш,
Што бяда адною
У дзверы не заходзіць,
А вядзе за руку
Здраду, гора, боль.
І тады ўсё — "сэрца на далоні",
І вялікі роў у сэрцы,
І яго прысыпаць
Ты захочаш соллю.
І калі ты выжывеш —
То станеш стальною.

**Екатерина БЕРГЕР**
*студентка биологического факультета БГУ*

***

Я строила себе дом:
Кирпичами мне служила
Моя боль.
Много её — большой дом,
Но тесно мне в нём.
Вместо цемента
Взяла я горе,
Вместо воды — слёзы.
Крепкие стены,
Но крыша протекает:
Хотела покрыть её
надеждой,
Да мало её осталось.
И окна слепые,
без стёкол —
разбились мечты...

***

Там, где-то в сумраке вечернем,
Там, где лежит ночная тень,
Там, где печаль живёт, наверно,
Там зародился этот день.

Такой же серый и унылый,
Хоть всё улыбками цвело,
Но мне печаль попала в сердце,
Хоть я не знаю отчего.

И мне казалось, что повсюду,
На всём лежит печаль и грусть.
И так хотелось верить в чудо,
Что добьётся кто-нибудь.

**Елена БИБИКОВА**
*студентка географического факультета БГУ*

***

В чем глубина?
Возможно, манит выбор...
Когда нехожена еще стезя,
И не апостол, и не мытарь,
А ждать во времени нельзя.

И мы остановились во Вселенной,
Глядим с глубокой нежностью в глаза.
Не веришь? Жизнь пройдет мгновенно,
И не успеешь слов связать.

А Бог сомкнет сухие губы,
Душа взовьется в небеса
И с высоты взглянет на грубость,
Сама безмолвна, как роса.

**Кристина КУЗЬМЕНКОВА**
*студентка биологического факультета БГУ*

### ДВЕ ЖИЗНИ

Как будто камень брошен в воду,
И невозможно не любить...
Как хочется мне поровну любовь мою
С тобой, любимый, навеки разделить!
Разрезать, словно лезвием
опасной бритвы,
напополам — тебе и мне —
две наши жизни.
Потом сложить — в диффузии
сойтись.
И не бояться тебе за меня,
А мне за тебя — жизни потерять.
А сердце снова быстро бьется.
Опять его мне не понять.
Ну, что ты снова бьешься,
За кого сегодня, о сердце,
Готово жизнь свою отдать?
Куда стремительно летишь?
И счастием своим
никак ты не напьешься.
Те жизни две прошли.
А с новым чувством что?
Напополам...
На жизни две.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*11 снежня 2003 года*
*Падпісана да друку 10.12.2003*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1318. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*